КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.В.Макоўчык
«__» ______ 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-2-57/уч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура.
Замежная мова (з указаннем мовы)

2023 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021 і АСВА 1-02 03 03-2021, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 20.04.2022 № 85; вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

У.П.Саўко, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

І.М.Саніковіч, дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

А.У.Перавозны, дацэнт кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Мінска імя В. П.Чкалава» ____________ П.П.Мазалеўскі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 11 ад 30.05.2023 г.)

Загадчык кафедры
Д.В.Дзятко ____________

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 6 ад 21.06.2023 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае
Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы» распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 1–02 03 01 Беларуская мова і літаратура, 1–02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы).

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» – тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы** вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з мэтай, задачамі, прынцыпамі, метадамі, сродкамі, формамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў, са зместам і структурай школьнага курса беларускай мовы, з сучаснымі тэхналогіямі навучання прадмету;

– даць уяўленне аб працэсе навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

– удасканаліць навыкі аналізу навучальнага працэсу па беларускай мове;

– навучыць студэнтаў планаваць вучэбны працэс, распрацоўваць планы-канспекты ўрокаў розных тыпаў, падбіраць неабходны дыдактычны матэрыял для канкрэтнага ўрока;

– сфарміраваць элементарныя ўменні правядзення ўрокаў розных тыпаў з выкарыстаннем разнастайных метадаў і прыёмаў навучання;

– садзейнічаць падрыхтоўцы студэнтаў да выканання функцый настаўніка беларускай мовы.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.**

У сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй вучэбная дысцыпліна адносіцца да модуля «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» дзяржаўнага кампанента.

«Методыка выкладання беларускай мовы» – адна з прафіліруючых вучэбных дысцыплін на філалагічных факультэтах устаноў вышэйшай адукацыі. Ад якасці прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў па методыцы выкладання беларускай мовы залежыць ступень засваення імі тэорыі навучання школьнікаў беларускай мове і ўзровень развіцця ўменняў вучыць дзяцей эфектыўна карыстацца беларускай мовай у розных сферах яе прымянення. Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» асноўваецца на метадалогіі навуковага пазнання і тэорыі кіравання вучэбнай дзейнасцю, на сучасных дасягненнях методыкі, педагогікі, лінгвістыкі, псіхалогіі і іншых навук.

**Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» звязана з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі «Асновы псіхалогіі і педагогікі»,

«Педагогіка», «Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін».

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў універсальнай кампетэнцыі **УК–6**: Ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўмовах абнаўлення яе мэт, зместу, змены тэхналогій, вызначаць метады вырашэння прафесійных задач, ацэньваць іх эфектыўнасць і якасць; базавай прафесійнай кампетэнцыі **БПК–1**: Праектаваць працэс навучання, ставіць навучальныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці; базавай прафесійнай кампетэнцыі **БПК**–5: Ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнца; базавай прафесійнай кампетэнцыі **БПК**–8: Кіравацца нарматыўнымі прававымі актамі ў галіне адукацыі, распрацоўваць вучэбна-плануючую дакументацыю, працаваць з рознымі відамі школьнай дакументацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць**:

– мэту, змест, прынцыпы, метады, сродкі і арганізацыйныя формы навучання вучняў беларускай мове;

– асаблівасці выкладання беларускай мовы ў розных умовах навучання;

– змест школьных праграм і падручнікаў усіх узроўняў;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець**:

– планаваць і арганізоўваць навучальны працэс па прадмеце;

– праводзіць розныя тыпы ўрокаў па беларускай мове;

– бачыць пераемнасць і перспектыўнасць у навучанні;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць**:

– уменнем вызначаць і вырашаць дыдактычныя, развіццёвыя і выхаваўчыя задачы ўрокаў беларускай мовы, адбіраць вучэбны матэрыял, абгрунтавана выкарыстоўваць розныя тыпы ўрокаў, формы, метады і прыёмы навучання;

– навыкамі выкарыстання сучасных тэхналогій у навучанні беларускай мове.

Вучэбная дысцыпліна на дзенным аддзяленні чытаецца на 3 курсе ў 5 семестры. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ўсяго адводзіцца 100 гадзін, у тым ліку 48 аўдыторных гадзін (24 гадзіны лекцыйныя, 24 гадзіны практычныя), самастойная праца 52 гадзіны.

Форма атэстацыі – экзамен.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма кантролю** |
|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 100 | 24 | 24 | 52 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ РАЗДЗЕЛАЎ КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДКАЦЫІ

### 1.1. Методыка вывучэння фанетыкі

Значэнне, змест, задачы вывучэння фанетыкі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі (апора на маўленчы слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Метады і прыёмы вывучэння фанетычных тем. Характар і віды фанетычных і фанетыка-графічных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор, методыка яго правядзення.

Фарміраванне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні фанетыкі. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны.

### 1.2. Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі

Значэнне, змест, задачы, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Методыка азнаямлення вучняў з асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў.

Методыка ўзбагачэння і актывізацыі лексічнага і фразеалагічнага запасу школьнікаў. Фарміраванне ўмення працаваць са слоўнікамі розных тыпаў.

### 1.3. Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння

Значэнне і задачы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Прыватнаметадычныя прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння марфемнай будовы слова і словаўтварэння. Сістэма практыкаванняў і заданняў.

Марфемны і словаўтваральны разборы, методыка іх правядзення.

Удасканаленне словаўтваральных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.

Выкарыстанне марфемнага і словаўтваральнага слоўнікаў на ўроках роднай мовы.

### 1.4. Методыка вывучэння марфалогіі

Месца і значэнне раздзела "Марфалогія і арфаграфія" ў школьным курсе роднай мовы. Мэты і змест вывучэння часцін мовы. Прыватнаметадычныя прынцыпы навучання марфалогіі. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі.

Віды марфалагічных практыкаванняў. Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.

Узнаўленне ведаў па марфалогіі пры вывучэнні сінтаксісу. Арганізацыя працы па развіцці маўлення пры вывучэнні марфалогіі. Удасканаленне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні марфалагічных тэм.

### 1.5. Методыка вывучэння сінтаксісу

Месца і значэнне сінтаксісу ў школьным курсе беларускай мовы. Мэты, змест, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў. Этапы вывучэння сінтаксісу ў школе. Вывучэнне прапедэўтычнага курса сінтаксісу ў 5 класе. Арганізацыя працы па сінтаксісе пры вывучэнні марфалогіі ў 5–7 класах. Вывучэнне сістэматычнага курса сінтаксісу ў 8–9 класах.

Віды сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор, методыка яго правядзення.

Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні сінтаксісу.

### 1.6. Методыка навучання арфаграфіі

Мэты навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі. Псіхалагічныя і метадычныя ўмовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.

Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Развіццё арфаграфічных уменняў у 8–9 і 10–11 класах.

Месца і роля арфаграфічнага слоўніка ў сістэме навучання правапісу. Віды практыкаванняў са слоўнікам, іх метадычная мэтазгоднасць.

Папярэджанне арфаграфічных памылак, іх прычыны. Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Методыка работы над арфаграфічнымі памылкамі на ўроках мовы.

### 1.7. Методыка навучання пунктуацыі

Мэты навучання пунктуацыі, яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест і этапы навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі (пунктаграма, пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак), методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

Асаблівасці навучання пунктуацыі пры вывучэнні несінтаксічных тэм у 5–7 класах. Удасканаленне пунктуацыйных уменняў у сувязі з развіццём звязнага маўлення вучняў. Праца па пунктуацыі ў 10–11 класах. Методыка работы над пунктуацыйнымі памылкамі.

## РАЗДЗЕЛ 2. МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ

### 2.1. Пераказ ў сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў

Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабу перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, (поўныя), блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з дадатковым заданнем) і інш.

Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

### 2.2. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў

Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення, сродак самавыражэння асобы вучня, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпу

тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанру (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія  і г.д.) і інш.

Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

**2.3. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў**

Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу.

Методыка правядзення перакладаў.

**2.4. Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў**

Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац .

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | | | |
| | **Методыка выкладання беларускай мовы** | **24** | **24** | **52** | | |
| **1.** | **Методыка вывучэння раздзелаў курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі** | **18** | **20** | **32** | | |
| **1.1.** | **Методыка вывучэння фанетыкі**<br>Значэнне, змест, задачы вывучэння фанетыкі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі (апора на маўленчы слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Метады і прыёмы вывучэння фанетычных тем. Характар і віды фанетычных і фанетыка-графічных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор, методыка яго правядзення.<br>Фарміраванне арфаэпічных і акцэнталагічных навыкаў пры вывучэнні фанетыкі. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны. | 2 | 2 | 4 | 1, 2(д), 7(д) | Тэсціраванне |
| **1.2.** | **Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі**<br>Значэнне, змест, задачы, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння лексікі і фразеалогіі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Методыка азнаямлення вучняў з асноўнымі лексічнымі і фразеалагічнымі паняццямі. Віды лексічных і фразеалагічных практыкаваняў.<br>Методыка ўзбагачэння і актывізацыі лексічнага і фразеалагічнага запасу школьнікаў. Фарміраванне ўмення працаваць са слоўнікамі розных тыпаў. | 2 | 2 | 4 | 1, 3(д), 7(д) | Тэсціраванне |
| **1.3.** | **Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння**<br>Значэнне і задачы вывучэння словаўтварэння. Прыватна-метадычныя прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння марфемнай будовы слова і практыкаванняў і заданняў.<br>Марфемны і словаўтваральны разборы, методыка іх правядзення.<br>Удасканаленне словаўтваральных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.<br>Выкарыстанне марфемнага і словаўтваральнага слоўнікаў на ўроках роднай мовы. | 2 | 2 | 4 | 1, 9(д) | Пісьмовая работа (канспект урока) |
| **1.4.** | **Методыка вывучэння марфалогіі**<br>Месца і значэнне раздзела "Марфалогія і арфаграфія" ў школьным курсе роднай | 2 | 4 | 4 | 1, 6(д), | Мадэляванне фрагмента ўрока |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | мовы. Мэты і змест вывучэння часцін мовы. Прыватна-метадычныя прынцыпы навучання марфалогіі. Методыка азнаямлення вучняў з марфалагічнымі паняццямі.<br>Віды марфалагічных практыкаванняў. Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.<br>Узнаўленне ведаў па марфалогіі пры вывучэнні сінтаксісу. Арганізацыя працы па развіцці маўлення пры вывучэнні марфалогіі. Удасканаленне арфаграфічных навыкаў пры вывучэнні марфалагічных тэм. | | | | 7(д),<br>8(д) | |
| **1.5.** | **Методыка вывучэння сінтаксісу**<br>Месца і значэнне сінтаксісу ў школьным курсе беларускай мовы. Мэты, змест, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу. Фарміраванне сінтаксічных паняццяў. Этапы вывучэння сінтаксісу ў школе. Вывучэнне прапедэўтычнага курса сінтаксісу ў 5 класе. Арганізацыя працы па сінтаксісе пры вывучэнні марфалогіі ў 5–7 класах. Вывучэнне сістэматычнага курса сінтаксісу ў 8–9 класах.<br>Віды сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор, методыка яго правядзення.<br>Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні сінтаксісу. | 2 | 2 | 4 | 1,<br>7(д),<br>9(д) | Мадэляванне фрагмента ўрока |
| **1.6.** | **Методыка навучання арфаграфіі**<br>Мэты навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі. Псіхалагічныя і метадычныя ўмовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.<br>Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.<br>Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Развіццё арфаграфічных уменняў у 8–9 і 10–11 класах.<br>Месца і роля арфаграфічнага слоўніка ў сістэме навучання правапісу. Віды практыкаванняў са слоўнікам, іх метадычная мэтазгоднасць.<br>Папярэджанне арфаграфічных памылак, іх прычыны. Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Методыка работы над арфаграфічнымі памылкамі на ўроках мовы. | 6 | 4 | 6 | 1,<br>4(д),<br>7(д) | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| **1.7.** | **Методыка навучання пунктуацыі**<br>Мэты навучання пунктуацыі, яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест і этапы навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.<br>Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі (пунктаграма, пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак), методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне | 2 | 4 | 6 | 1,<br>7(д),<br>9(д) | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.<br>Асаблівасці навучання пунктуацыі пры вывучэнні несінтаксічных тэм у 5–7 класах. Удасканаленне пунктуацыйных уменняў у сувязі з развіццём звязнага маўлення вучняў. Праца па пунктуацыі ў 10–11 класах. Методыка работы над пунктуацыйнымі памылкамі. | | | | | |
| **2.** | **Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў** | **6** | **4** | **20** | | |
| **2.1.** | **Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў**<br>Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабу перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, (поўныя), блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з дадатковым заданнем) і інш.<br>Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў. | 2 | 2 | 4 | 5, 1(д), 7(д) | Пісьмовая работа (канспект) |
| **2.2** | **Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў**<br>Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення, сродак самавыражэння асобы вучня, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпу тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанру (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія і г.д.) і інш.<br>Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў. | 2 | | 6 | 1, 1(д), 7(д) | Пісьмовая работа (канспект) |
| **2.3** | **Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў**<br>Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу.<br>Методыка правядзення перакладаў. | 2 | | 4 | 1, 1(д), 7(д) | Пісьмовая работа (канспект) |
| **2.4** | **Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў**<br>Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац . | | 2 | 6 | 4, 5, 5(д) | Пісьмовая работа (канспект нарматыўнага дакумента) |
| | **Усяго ў 5 семестры** | **24** | **24** | **52** | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**АСНОЎНАЯ**

1. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання беларускай мовы” / Складальнік У. П. Саўко. – Мінск: БДПУ, 2019. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/bitstream/doc/6319/3/ВМК%20Методыка%20выкладання%20беларускай%20мовы.pdf

2. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/304-uchebnye-predmety-v-xi-klassy-2022-2023/3798-belaruskaya-mova.html

3. Вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: http://e-padruchnik.adu.by/

4. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/3781-metodicheskie-rekomendatsii.html

5. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/3781-metodicheskie-rekomendatsii.html

**ДАДАТКОВАЯ**

1. Валочка, Г. М. Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5–10 класы / Г. М. Валочка. – Мінск : НІА, 2005. – 201 с.

2. Выгонная, Л. Ц. Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мінск : Народная асвета, 1995. – 236 с.

3. Даніловіч, М. А. Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М. А. Даніловіч. – Мінск : Народная асвета, 1991. – 94 с.

4. Зелянко, В. У. Навучанне арфаграфіі беларускай мовы ў 5—11 класах: тэорыя і практыка: манаграфія / В. У. Зелянко. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2016. – 194 с.

5. Казлова, А. У. Карэкцыйная работа на ўроках беларускай мовы : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А. У. Казлова. – Мазыр : Выснова, 2019. – 73 с.

6. Лаўрэль, Я. М. Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мінск : Народная асвета, 1991. – 158 с.

7. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей установаў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

8. Саўко, У. П. Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) / У. П. Саўко. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 107 с.

9. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей установаў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі, У. П. Саўко, Л. С. Васюковіч; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2006. –336 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Для павышэння якасці прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Яе змест і формы распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту, Палажэннямі і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі, вучэбна-метадычных аб'яднанняў і саветаў устаноў вышэйшай адукацыі.

Матэрыял для самастойнай працы можа ўключаць комплексы групавых і індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму самастойных і кантрольных работ па тэмах і раздзелах вучэбнай дысцыпліны і інш. На самастойнае вывучэнне можна прапаноўваць асобныя тэмы лекцый і практычных заняткаў або пэўныя іх часткі з указаннем пытанняў, адказы на якія неабходна будзе знайсці ў навукова-метадычнай літаратуры. Выкладчыкам варта памятаць, што матэрыял, прапанаваны для самастойнага вывучэння, павінен быць не вельмі складаным і даступным для засваення кожным студэнтам.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Гэта і аптымальна выбраныя формы працы, і дакладныя, канкрэтныя рэкамендацыі і ўказанні выкладчыка, і своечасовая аб'ектыўная ацэнка яе вынікаў, і, безумоўна, сістэматычнасць і мэтанакіраванасць у правядзенні працы.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Коль-касць гадзін | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Методыка вывучэння фанетыкі | 4 | Змадэляваць фрагмент урока | Вусна |
| 2 | Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі | 4 | Змадэляваць фрагмент урока | Вусна |
| 3 | Методыка вывучэння марфемнай будовы слова, словаўтварэння | 4 | Распрацаваць канспект урока | Пісьмова |
| 4 | Методыка вывучэння марфалогіі | 4 | Распрацаваць канспект урока | Пісьмова |
| 5 | Методыка вывучэння сінтаксісу | 4 | Змадэляваць фрагмент урока | Вусна |
| 6 | Методыка навучання арфаграфіі | 6 | Распрацаваць канспект урока | Пісьмова |
| 7 | Методыка навучання пунктуацыі | 4 | Змадэляваць фрагмент урока | Вусна |
| 8 | Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення | 4 | Заканспектаваць матэрыял па тэме “Методыка правядзення выбарачнага пераказу” | Пісьмова |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9 | Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення | 6 | Заканспектаваць матэрыял па тэме | Пісьмова |
| 10 | Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў | 4 | Падабраць дыдактычны матэрыял па тэме | Пісьмова |
| 11 | Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў | 8 | Заканспектаваць нарматыўны дакумент | Пісьмова |

# ПРЫКЛАДНЫЯ ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Кантрольная рэйтынгавая работа № 1

Пытанні для кантрольнай рэйтынгавай работы № 1

1. Сфармулюйце асноўную і прыватныя задачы навучання арфаграфіі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Пералічыце этапы, на якіх гэтыя задачы вырашаюцца.
2. Якія ўмовы фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў вы ведаеце? У чым іх сутнасць?
3. Дайце азначэнне паняццю “арфаграма”. У якой паслядоўнасці адбываецца азнаямленне з арфаграмай, арфаграфічным правілам?
4. Ахарактарызуйце спісванне як від арфаграфічнага практыкавання.
5. Раскажыце пра методыку правядзення папераджальнага і выбарачнага дыктантаў.
6. Ахарактарызуйце слоўнікавы дыктант як від арфаграфічнага практыкавання.
7. Раскажыце пра методыку правядзення тлумачальнага дыктанта. У чым сутнасць дыктанта “Правяраю сябе?”
8. Пералічыце неспецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні. Раскажыце пра методыку правядзення вольнага і творчага дыктантаў.
9. Якім патрабаванням павінен адпавядаць тэкст кантрольнага дыктанта? Як праводзіцца кантрольны дыктант?
10. Раскажыце пра методыку работы над памылкамі на ўроках беларускай мовы.

## Кантрольная рэйтынгавая работа № 2

Пытанні для кантрольнай рэйтынгавай работы № 2

1. Якія памылкі не ўлічваюцца пры ацэнцы кантрольных работ і не выносяцца на палі?

2. Якія памылкі адносяцца да аднатыпных? Як яны ўлічваюцца пры ацэнцы пісьмовых работ?

3. Якія арфаграфічныя памылкі адносяцца да нягрубых? Пералічыце іх.

4. Ці ўплывае на адзнаку наяўнасць у пісьмовай рабоце выпраўленняў?

5. Сфармулюйце мэту і задачы навучання пунктуацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Назавіце этапы вывучэння пунктуацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Якія веды па пунктуацыі атрымліваюць вучні на кожным з гэтых этапаў?

7. Пры якіх умовах адбываецца паспяховае засваенне вучнямі пунктуацыйных нормаў?

8. Дайце азначэнне паняццям “пунктаграма”, “пунктуацыйнае правіла”. Якія этапы выдзяляюцца ў працы над пунктуацыйным правілам?

9. Якія практыкаванні выкарыстоўваюцца для фарміравання пунктуацыйных уменняў вучняў?

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

З мэтай дыягностыкі ўзроўню засваення студэнтамі ведаў, сфарміраванасці неабходных уменняў выкарыстоўваюцца бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы кантроль.

Дыягностыка вынікаў вучэбнай дзейнасці па дысцыпліне “Методыка выкладання беларускай мовы” можа мець наступныя формы:

– вусны кантроль: індывідуальнае, франтальнае апытванне, вусны аналіз метадычнага матэрыялу, вусны адказ на экзамене;

– пісьмовы кантроль: кантрольныя работы, напісанне разгорнутых канспектаў урока, канспектаванне нарматыўных дакументаў, пісьмовы адказ на экзамене;

– тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

## ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ "МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"

1. Методыка вывучэння фанетыкі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння фанетыкі.

2. Методыка вывучэння фанетыкі. Практыкаванні на фарміраванне фанетычных уменняў і навыкаў. Вымаўленчыя памылкі, іх прычыны.

3. Методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння лексікі і фразеалогіі. Практыкаванні на фарміраванне лексічных і фразеалагічных уменняў і навыкаў.

4. Методыка вывучэння будовы слова і словаўтварэння. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння будовы слова, словаўтварэння. Практыкаванні на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў пры вывучэнні будовы слова і словаўтварэння.

5. Методыка вывучэння марфалогіі. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. Практыкаванні на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў пры вывучэнні часцін мовы.

6. Методыка вывучэння сінтаксісу. Змест, задачы, прынцыпы, метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу. Практыкаванні на фарміраванне сінтаксічных уменняў і навыкаў.

7. Методыка навучання арфаграфіі. Значэнне, задачы, этапы навучання арфаграфіі ў школе. Умовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

8. Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам.

9. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (спісванне, папераджальны, тлумачальны і каменціраваны дыктанты).

10. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (дыктант "Правяраю сябе", выбарачны, слоўнікавы, камбінаваны дыктанты, пісьмо па памяці).

11. Кантрольны дыктант, яго віды. Методыка правядзення кантрольнага дыктанта.

12. Неспецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (вольны дыктант, творчы дыктант і інш.).

13. Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7 класах. Праца па арфаграфіі ў 8–9 і 10–11 класах.

14. Методыка вывучэння пунктуацыі. Мэты навучання пунктуацыі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Пунктуацыйныя ўменні. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

15. Методыка вывучэння пунктаграмы, пунктуацыйнага правіла.

16. Методыка навучання пунктуацыі. Практыкаванні на навучанне пунктуацыі.

17. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

18. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: памылкі, якія не ўлічваюцца пры ацэнцы пісьмовых работ. Аднатыпныя памылкі.

19. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: нягрубыя арфаграфічныя памылкі.

20. Методыка работы над памылкамі на ўроках беларускай мовы. Структура ўрока работы над памылкамі (урока карэкцыі ведаў, уменняў і навыкаў).

21. Пераказ як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання пераказу на ўроках беларускай мовы. Класіфікацыя пераказаў.

22. Методыка правядзення падрабязнага пераказу (навучальнага і кантрольнага).

23. Сціслы пераказ, методыка яго правядзення.

24. Выбарачны пераказ, методыка яго правядзення.

25. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя сачыненняў. Спосабы падрыхтоўкі да сачыненняў.

26. Методыка правядзення сачыненняў розных відаў.

27. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

28. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў: маўленчыя памылкі.

29. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў: граматычныя памылкі.

30. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладу.

## ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1

**Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.**

1. У канцы жніўня і ў пачатку верасня дзед збіраў падасінавікаў і баравікоў.
2. Толькі праз тры дні пасля аперацыі хворы пачаў адкрываць вочы.

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2

**Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.**

1. Мясцовы хор наведваюць як маладыя маладзіцы, так і старэнькія бабулькі.
2. Каля мясцовага клубу ўжо сабралася многа народа.

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 3

**Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.**

1. На тэрыторыі Беларусі жывуць прадстаўнікі больш як ста нацыянальнасцяў.
2. Пажылы зубр павольна ішоў да агароджы вальеры.

### Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 4

**Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.**

1. Пэўныя лічбы выпускнікоў пасля заканчэння ўніверсітэта атрымліваюць накіраванне на працу.
2. Стартуе самы маладзёжны праект “Адкрытая пляцоўка”!

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| Асновы псіхалогіі і педагогікі | Кафедра псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № ___ ад __.__.2023 г. |
| Педагогіка | Кафедра педагогікі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № ___ ад __.__.2023 г. |
| Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № ___ ад __.__.2023 г. |